Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

***А.М. Шубадзёрава*** (Магілёў)

# ЭЛІПСІС І ПАРЦЭЛЯЦЫЯ ЯК СПОСАБЫ ПАБУДОВЫ ГАЗЕТНЫХ ЗАГАЛОЎКАЎ

Важную ролю ва ўспрыманні газетнай публікацыі адыгрывае яе назва. Для стварэння газетных загалоўкаў выкарыстоўваюцца разнастайныя моўныя сродкі, аднак выбар моўных сродкаў залежыць у першую чаргу ад тых патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да загалоўка. На думку многіх даследчыкаў, газетны загаловак павінен выконваць некалькі функцый: 1) інфармацыйна-намінацыйную, 2) экспрэсіўную (рэкламна-экспрэсіўную), 3) прагматычную, 4) графічна-вылучальную.

Каб зрабіць газетны загаловак інфармацыйна ёмістым і разам з тым эмацыйным, журналісты даволі часта выкарыстоўваюць **эліптычныя канструкцыі**. Яны ўяўляюць сабой двухсастаўны сказ з прапушчаным дзеясло-

вам выказнікам. Такія канструкцыі распадаюцца на дзве сэнсава важныя часткі, аддзеленыя паўзай і графічна працяжнікам. Адна з гэтых частак складаецца з назоўніка (ці іншай субстантываванай часціны мовы) з залежнымі ад яго словамі або без іх у назоўным склоне, а другая – з іменнага словазлучэння (ці часціны мовы) ва ўскосным склоне: *Кефір і мыццё рук – супраць прастуды* [2: № 11, с. 6], *Школьная рэформа – пад прыцэлам маніторынгу* [2: № 7, с. 2], *Замест артылерыі – новы жылы раён* [2: № 11, с. 3], *У абароце – усплеск фальшывак* [1: № 233, с. 2], *Высокія абцасы і вузкія насы – не для зімовых вуліц* [1: № 226, с. 3]. У такога тыпу эліптычных канструкцыях словазлучэнне ў назоўным склоне абазначае тэму паведамлення, а словазлучэнне ва ўскосным склоне не толькі пашырае інфармацыйны змест абазначанай тэмы, але і прадвызначае лексічнае значэнне прапушчанага дзеяслова: *Жаночы мозг – супраць дыет* (*выступае*) [2: № 11, с. 4].

Структурна падобнымі да разгледжаных з'яўляюцца загалоўкі без працяжніка паміж іменнымі кампанентамі: *Беларускае рэха ў Сант'яга* [2: № 11, с. 1], *Школа будучыні ў Гомелі* [2: № 4, с. 4], *Сонечны гадзіннік у Лідзе* [1: № 227, с. 1], *Магніт для замежнага турыста* [1: № 228, с. 3], *Маці па найме* [1: № 224, с. 2]. Адсутнасць працяжніка ў гэтых загалоўках збліжае іх з намінатыўнымі канструкцыямі з азначальна-акалічнаснымі ці азначальна-дапаўняльнымі адносінамі і ўскладняе аднаўленне прапушчанага дзеяслова.

Трэба заўважыць, што наяўнасць назоўніка ў назоўным склоне ў структуры загалоўкаў такога тыпу не з'яўляецца абавязковай. Даволі часта журналісты выкарыстоўваюць эліптычныя канструкцыі з розным спалучэннем назоўнікаў ва ўскосных склонах. Яны (канструкцыі) маюць адметнае прызначэнне – выражаюць пабуджэнне да дзеяння, патрабаванне, заклік: *Усё лепшае – сэрцу* [2: № 34, с. 7], *Па прадукты– на рынак у "спальніку"* [2: № 29, с. 4], *За адукацыяй – у беларускія ВНУ* [1: № 235, с. 3], *Кожнаму беларускаму школьніку – па ноўтбуку* [1: № 240, с. 3].

Важная роля ў пабудове газетных загалоўкаў належыць такому сінтаксічнаму прыёму, як **парцэляцыя**. Гэты прыём дае магчымасць:

а) падзяліць выказванне на часткі, якія хутка і лёгка ўспрымаюцца паасобку, а не цалкам, а таксама вылучыць у загалоўку асобныя кампаненты і надаць ім большую сэнсавую ці эмацыйную нагрузку: *Жыллё падае. У цане* [1: № 238, с. 1], *Мядзведзь? І пад Бабруйскам?* [1: № 224, с. 1], *Усё пра усіх. Па-беларуску* [2: № 12, с. 1], *Мастакі малююць. Рэальна* [2: № 24, с. 6];

б) пашырыць змест асноўнай часткі загалоўка, дадаць новую інфармацыю. Такую функцыю выконваюць як бяззлучнікавыя парцэляваныя канструкцыі, так і злучнікавыя: *Дакументаў хапае. Засталося прымяніць іх на практыцы* [2: № 35, с. 3], *Заробкі будуць узрастаць. Але пры гэтым зменшацца тэмпы* [2: № 19, с. 2], *Дзяцей больш! А шлюбаў менш...* [1: № 240, с. 5], *Будзьма разам! І тады мы будзем* ![2: № 10, с. 2]. Злучнікі *але, аднак, а, і* –

найбольш ужывальныя сродкі далучэння парцэлятаў да базавай часткі загалоўка;

в) удакладніць, канкрэтызаваць асноўную тэму, звярнуць увагу на найбольш істотныя дэталі. Парцэляваныя загалоўкі са значэннем удакладнення маюць адметную будову: асноўная частка – гэта назоўны тэмы (ці аналагічная канструкцыя), а парцэляваная – сказ ці яго частка. Назоўны тэмы вылучае найбольш важны элемент выказвання, а парцэлят дэталізуе, канкрэтызуе яго: *Крызіс: прамежкавыя вынікі і ўрокі* [1: № 239, с. 5], *Доля прамыславіка: працаваць, гандляваць, круціцца* [2: № 36, с. 4], *Пенсіі: усё, што вам цікава* [1: № 235, с. 1], *Аксіёма: перакусіць... і паесці зноў* [1: № 230, с. 3].

Даволі часта парцэляваная частка газетнага загалоўка ўтрымлівае пытанне. Яно дапамагае засяродзіць увагу чатача на актуальных падзеях, прымушае яго актыўна ўспрымаць тое, пра што паведамляецца, а таксама дакладна выказаць аўтарскае меркаванне ў дачыненні да апісаных фактаў рэальнага жыцця: *"Старт" больш марудны. Што далей?* [2: № 34, с. 1], *Шлюбны дагавор: разлік ці пацвярджэнне кахання?* [2: № 11, с. 7], *Новы год у Мінску: куды пайсці, што паглядзець?* [1: № 239, с. 2].

Адначасова з парцэляцыяй і эліпсісам для актуалізацыі газетных загалоўкаў выкарыстоўваюцца і іншыя прыёмы экспрэсіўнага сінтаксісу, такія як інверсія: *Любімым выканаўцам – па вуху. Залатому* [2: № 40, с. 8], антытэза: *З праблемамі. Але без узрушэнняў* [2: № 30, с. 1], паўтор: *Будуць камп'ютары. Будзе інтэрнэт* [2: № 10, с. 3] і інш.

**Літаратура**

1. Газета "Звязда" за 2008 г.
2. Газета "Звязда" за 2009 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова